# Змест

Першы раздзел.
**Белы лабрадор** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 9

Другі раздзел.
**Скарбонкі мары і альбомы мары** . . . . . . . . . . . . . 25

Трэці раздзел.
**Дэрыл — хлопчык, які шмат зарабляў** . . . . . . . . . . . 41

Чацвёрты раздзел.
**Чым зарабляе мой стрыечны брат** . . . . . . . . . . . . 57

Пяты раздзел.
**Былы гаспадар Мані** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 71

Шосты раздзел.
**Даўгі: што мае бацькі рабілі не так** . . . . . . . . . . . 83

Сёмы раздзел.
**У спадара Гольдштэрна** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 95

Восьмы раздзел.
**Спадарыня Трумпф** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 109

Дзявяты раздзел.
**Прыгода** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 119

Дзясяты раздзел.
**У старым сутарэнні** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 131

Адзінаццаты раздзел.
**Бацькі не разумеюць...** . . . . . . . . . . . . . . . . . . 141

Дванаццаты раздзел.
**Вяртанне спадарыні Трумпф** . . . . . . . . . . . . . . . . . 153

Трынаццаты раздзел.
**Вялікі крызіс** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 167

Чатырнаццаты раздзел.
**Інвестыцыйны клуб** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 177

Пятнаццаты раздзел.
**Выступленне** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 193

Шаснаццаты раздзел.
**Клуб пачынае інвеставаць** . . . . . . . . . . . . . . . . . 201

Сямнаццаты раздзел.
**Бабуля з дзядулем пазбягаюць рызыкі** . . . . . . . . . . . 215

Васямнаццаты раздзел.
**Канец вялікай прыгоды** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229

Пасляслоўе.
**Стаяць на сваіх нагах** . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 237

«Прадмова» для дарослых . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 245

Дадатак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 261

## Першы раздзел

# Белы лабрадор

Я вельмі даўно марыла пра сабаку. Аднак мы здымалі кватэру ў вялікім доме, дзе гаспадар забараняў заводзіць жывёл. Мой тата спрабаваў з ім дамовіцца, але марна! Ёсць людзі, з якімі гэта немагчыма. Гаспадар сцвярджаў, нібыта сабака будзе нейкім чынам перашкаджаць іншым жыхарам дома. Поўная лухта! Я дакладна ведала: сем'і на трэцім і чацвёртым паверхах марылі пра сабак, як і я. Ясна, што гаспадар проста не любіў жывёл.

Аднойчы тата сказаў:

— Праблема зусім не ў сабаку. Ён сам сябе не любіць і не хоча, каб іншым было добра.

Пасля гэтага я пачала ўважліва назіраць за гаспадаром. Ён сапраўды выглядаў злосным і незадаволеным. Калі мама таксама паспрабавала паразмаўляць з ім, ён нават даслаў заказным лістом папярэджанне, што можа выселіць нас.

Я да сённяшняга дня ўпэўненая: ніхто не мае права забараняць іншым заводзіць сабак. І ёсць сэнс купіць дом толькі дзеля таго, каб трымаць у ім жывёл.

Неўзабаве мае бацькі сапраўды набылі дом з садам. У мяне з'явіўся свой пакой, і я адчувала сябе нібы на сёмым небе. Але бацькі не выглядалі такімі ўжо шчаслівымі, бо дом, відаць, аказаўся даражэйшым, чым яны разлічвалі. Я, безумоўна, заўважыла, што з грашыма ў нас цяжка, і вырашыла некалькі тыдняў пачакаць са сваёй марай. А мне так хацелася займець сабаку!

Адным ранкам мама пабудзіла мяне і ўсхвалявана сказала:

— Кіра, хуценька ўставай. На двары перад домам ляжыць паранены белы сабака.

Я ўскочыла з ложка, пабегла ўніз і сапраўды пабачыла сабаку ў куце паміж домам і гаражом. Ён глыбока і неспакойна спаў.

На ягонай спіне, бліжэй да задніх лап, даволі моцна крываточыла рана даўжынёю з палец. Верагодна, яго пакусалі іншыя сабакі, пасля чаго ён дапоўз сюды і, знясілены, заснуў. «Як можна было напасці на такую прыгожую жывёліну?» — падумала я. Раптам сабака прачнуўся і паглядзеў на мяне сваімі вялікімі вачыма. Ён з цяжкасцю ўстаў, паспрабаваў падысці да мяне, але ягоныя лапы задрыжалі

ад слабасці і раз’ехаліся на гладкім камені. Сабака плюхнуўся на пуза. Мне стала так шкада яго.

Мы асцярожна перанеслі аслабелую жывёліну ў машыну і адвезлі да ветэрынара. Той зашыў вялікую рану на спіне і зрабіў некалькі ўколаў. Сабака адразу супакоіўся ды заснуў. Доктар пацвердзіў: небараку сапраўды пакусалі іншыя сабакі, але рана хутка загоіцца. Яшчэ ветэрынар вызначыў ягоную пароду. Аказалася, гэта лабрадор — вельмі разумная і ласкавая жывёліна, якая добра ладзіць з дзецьмі. Дзякуючы свайму рахманаму характару лабрадоры — найлепшыя сабакі-павадыры. Пакуль ветэрынар усё гэта расказваў, я гладзіла вялікага белага звера. Якая ў яго мяккая поўсць! Які ён мілы!

Сабака нават не заўважыў, як мы прывезлі яго дадому і паклалі ў кухні на посцілку. Я не спускала з яго вачэй і марыла, каб ён хутчэй паправіўся.

Я дарма хвалявалася. Лабрадор вельмі хутка ачуняў. Аднак тут з’явілася сур’ёзная праблема: мы не ведалі, адкуль ён узяўся і каму належаў. Ці мог ён проста застацца ў нас? А што, калі бацькі не захочуць яго пакінуць? У нас жа мала грошай. Ад такіх думак мне стала не па сабе.

Канешне, мы мусілі пашукаць гаспадара сабакі. Прызнаюся, у глыбіні душы я спадзявалася, што ён

не знойдзецца. Спачатку тата даў абвестку ў газету і абзваніў усе суседнія прытулкі для жывёл. Пра белага лабрадора ніхто не чуў. Ішоў час, да нас ніхто не звяртаўся, мае бацькі з кожным днём усё больш прывязваліся да сабакі, і ў нейкі момант ён стаў часткай нашай сям'і.

Неўзабаве сабака цалкам акрыяў. Адным ранкам я да знямогі насілася з ім па двары, а потым пайшла снедаць. Як заўсёды, за сталом вяліся размовы пра грошы. Лепш бы я іх не чула! Па-першае, я нічога ў гэтым не разумела, а па-другое, калі бацькі абмяркоўвалі грашовыя справы, то выглядалі такімі няшчаснымі!

Калі яны ненадоўга змоўклі, я перавяла размову на нешта нашмат важнейшае за грошы:

— Слухайце, а як сабаку завуць?

Тут да ўсіх раптам дайшло: мы не ведаем ягонай мянушкі. Я лічыла такое недапушчальным. Сабака мусіць мець імя! Я ўтаропілася ў гару чароўнай белай поўсці, што ляжала на посцілцы за тры метры ад мяне. Але ў галаву нічога не прыходзіла.

А бацькі працягвалі абмяркоўваць фінансы. Тата гучна ўздыхнуў:

— Мані, мані, мані… Усё круціцца вакол грошай!

Лабрадор раптам прачнуўся і падскочыў да таты.

— Мані! — усклікнула я. — Ён адгукаецца на Мані!

Сабака тут жа падбег да мяне.

## Другі раздзел

# Скарбонкі мары і альбомы мары

На наступны дзень мне было цяжка сканцэнтравацца на хатніх заданнях. Роўна ў чатыры гадзіны я пабегла ў сад. Белы лабрадор ужо чакаў мяне. Я адразу ўзяла яго на павадок, і мы скіраваліся ў лес. Не варта было гаварыць з ім, пакуль мы не дайшлі да нашай утульнай хованкі ў зарасніку ажыны. Каб да яе дабрацца, трэба было прапаўзці на карачках колькі метраў праз вузкі праход. Раней я расчысціла ў яго канцы невялікую пляцоўку, і там зрабілася па-сапраўднаму ўтульна. Пра нашу з Мані хованку ніхто не ведаў, тут мы былі ў бяспецы.

Я моцна хвалявалася: ці загаворыць ён са мной зноў? Хто ведае… У мяне было да яго столькі пытанняў, але я памятала: ён не хацеў размаўляць ні пра што, апроч грошай, і моўчкі чакала.

Мані паглядзеў на мяне, і я пачула:

— Ну як, Кіра, ці высветліла ты, навошта табе варта станавіцца багатай?

— Вядома, — паспяшалася адказаць я і выцягнула з кішэні паперку са спісам.

— Зачытай, — кіўнуў Мані.

Я пералічыла ўсе дзесяць пунктаў.

— А якія з іх самыя важныя?

— Яны ўсе важныя, — адказала я.

— Я табе веру і ўсё ж папрашу яшчэ раз прагледзець спіс і пазначыць тры самыя важныя пункты, — папрасіў сабака.

Я яшчэ раз уважліва перачытала спіс. Было вельмі цяжка вырашыць, што для мяне было найважнейшым. Урэшце я здолела зрабіць выбар і абвяла кружком тры жаданні:

5. Наступным летам паляцець у ЗША па праграме абмену.
10. Камп'ютар, найлепш ноўтбук.
6. Дапамагчы бацькам з іх даўгамі.

— Гэта вельмі важныя прычыны. Ты зрабіла разумны выбар, — Мані быў у захапленні. — Віншую!

Я адчула гонар, аднак мне быў не зусім зразумелы сэнс практыкавання. Мані, як заўсёды, прачытаў мае думкі і ўсё растлумачыў:

— Ёсць многа людзей, якія не зусім разумеюць, чаго яны хочуць. Яны ведаюць толькі, што хочуць займець больш, чым маюць. Паспрабуй уявіць, нібыта жыццё — своеасаблівая служба дастаўкі. Калі ты туды напішаш, што проста хочаш больш, чым маеш, то не атрымаеш нічога. Калі ты папросіш даслаць табе «нешта цудоўнае», з гэтага таксама нічога не атрымаецца. Так жыццё працуе з усімі нашымі жаданнямі. Мы мусім дакладна ведаць, чаго хочам.

Я засумнявалася:

— Хіба калі я буду ведаць свае жаданні, то яны ўсе спраўдзяцца?

— Дзеля гэтага, безумоўна, спатрэбіцца яшчэ нешта, — адказаў Мані. — Але першы і самы важны крок ты ўжо зрабіла.

— Занатаваўшы жаданні на паперку? — спытала я.

— Менавіта. Цяпер ты мусіш зазіраць у яе кожны дзень. Гэта будзе табе напамінам, і тады ты не прапусціш магчымасці, якія дазволяць табе здзейсніць жаданні.

— Вельмі цікава, ці яно спрацуе, — сказала я з недаверам.

Мані сур'ёзна паглядзеў на мяне:

— Калі ты будзеш з сумненнем да гэтага ставіцца, дык не спрацуе. Аднак ты можаш зрабіць тры

крокі, каб памяняць сваё стаўленне. Тут няма нічога складанага. Па-першае, я рэкамендую табе ўзяць чысты альбом і зрабіць з яго альбом мары. Знайдзі карцінкі з прадметамі сваіх жаданняў і ўклей іх у альбом. Мы мыслім вобразамі.

— Як — вобразамі? — не зразумела я.

— Думкі складаюцца не з літар, — патлумачыў Мані. — Вось, напрыклад, калі ты думаеш пра Каліфорнію, то бачыш слова «КАЛІФОРНІЯ» ці пэўныя вобразы, карцінкі?

Тут Мані меў рацыю: я, канешне, уяўляла сабе Дыснейлэнд, Сан-Францыска, Галівуд і падобнае.

— А дзе мне ўзяць такія карцінкі? — спытала я.

Мані дзіўна зірнуў на мяне: скура над ягонымі вачыма ссунулася, і мне здалося, ён хоча з мяне пасмяяцца.

— Добра, добра, — паспяшалася выправіцца я, — фота ноўтбука я знайду ў рэкламцы, а карцінкі з ЗША папрашу ў арганізацыі, якая займаецца праграмай па абмене. Але я ўсё роўна не разумею, дзеля чаго гэта ўсё?

— Часам не абавязкова разумець, як і чаму ўсё функцыянуе. Ці зможаш ты, напрыклад, патлумачыць, як працуе электрычнасць? — спытаў белы лабрадор.

Да такога пытання я не была гатовая. Ну чаму ён спытаў менавіта пра электрычнасць? Я змагла б